Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

## Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы"

# Беларусь і суседзі

Народы не выбіраюць сваіх суседзяў: іх зводзіць на адной прасторы гістарычны лёс, прымушаючы ўступаць ва ўзаемадзеянне, нярэдка драматычнае, і само яно, фарміруючы ў яго ўдзельнікаў новыя якасці, становіцца магутным фактарам народатворчасці. У ходзе гэтага ўзаемадзеяння фарміруюцца спецыфічныя для кожнага народа геапалітычныя і цывілізацыйныя ролі, яго характэрныя і пазнавальныя для іншых народаў "прыкметы". Разам з тым, у працэсе такога ўзаемадзеяння фарміруюцца і агульныя для яго ўдзельнікаў каштоўнасці, тое, што прымушае народы шукаць роўнавагі і калектыўнай плённай творчасці ў розных сферах.

У беларускай нацыянальнай культуры даўно склалася ідэя аб Беларусі як краіне памежжа, якая не належыць цалкам ні Ўсходу, ні Захаду.[1] Аднак, аднойчы сфарміраваўшыся, гэта ідэя доўгі час не развівалася, яе сапраўдная каштоўнасць дастаткова не выяўлена, у масавую свядомасць да нядаўняга часу яна ўваходзіла стыхійна і бытуе ў ёй павярхоўна, не стаўшы элементам фарміравання нацыянальнай годнасці і самапавагі. Пазначаная ёю рэчаіснасць яшчэ ясна не ўсведамляецца, як фактар сілы, а не слабасці, як прыкмета самабытнасці, а не безаблічнасці, як довад і адначасова як шанс гістарычнай трываласці беларускага народа. Па гэтай прычыне ўскладняецца ўспрыняцце масавай свядомасцю глыбінных, "вечных", цывілізацыйных асноў сувязі нашага народа з еўрапейскай сям'ёй народаў і той ролі, якую ён аб'ектыўна здольны выканаць – перш за ўсё, ва ўласных інтарэсах – і якой ад яго чакаюць яго суседзі. Гэта роля пасрэдніка, каталізатара і, несумненна, актыўнага ўдзельніка абменаў ідэямі, рэсурсамі, вынікамі творчай працы ў розных абласцях паміж Усходам і Захадам Еўропы. Толькі з нядаўняга часу і беларускія палітычныя эліты пачалі ўсведамляць геапалітычнае і культурна-геаграфічнае становішча Беларусі ў якасці маста для развіцця такіх узаемна выгадных, узбагачаючых народы сувязей. Гэту тэндэнцыю неабходна развіваць, а жадаючы дабра свайму народу, яе і немагчыма не развіваць усімі сродкамі, уключаючы і фундаметальныя сродкі гістарычнай навукі.

У гэтым нумары часопіса друкуюцца матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы". Канферэнцыя якраз і ставіла перад сабой задачы даследавання месца Беларусі сярод яе суседзяў па Усходняй і Цэнтральнай Еўропе, узаемадзеяння і ўзаемных уплываў народаў рэгіёна ў сувязі з працэсамі фарміравання нацый і дзяржаўнасці на гэтай прасторы. Яна праведзена ў другі раз. Як і на першай канферэнцыі, прайшоўшай у 2006 г.[2], важнае месца на ёй займалі пытанні палітычнага і культурнага ўзаемадзеяння народаў Рэчы Паспалітай, нацыятворчыя працэсы і нацыянальная палітыка ў заходніх рэгіёнах Расійскай імперыі, актуальныя праблемы гісторыі грамадства ў савецкую таталітарную эпоху. Выдзяляліся пытанні, звязаныя з гісторыяй беларускай і ўкраінскай нацыянальнай дзяржаўнасці і з гісторыяй міжнародных адносін навейшага часу. У канферэнцыі ў розных формах прынялі ўдзел каля 80 навукоўцаў з універсітэтаў, іншых навуковых і адукацыйных цэнтраў Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы. Дзякуючы выданню зборніка артыкулаў, падрыхтаваных на аснове матэрыялаў канферэнцыі, яна, спадзяемся, будзе мець не толькі навуковае, але і практычнае значэнне, паколькі паслужыць папулярызацыі ідэі аб разнастайнасці і багацці гістарычных шляхоў народаў Усходняй Еўропы, пры пераплеценні іх гістарычных лёсаў, паспрыяе фарміраванню паважлівага стаўлення да іх гістарычнай спадчыны.

*Лазько Р. Р., загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, д.г.н., прафесар*

---

[1] Гл. Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветапогляду. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993.
[2] «Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы», міжнародная навук. канф. (2006, Гомель). Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы», 28–29 верасня 2006 г.: [матэрыялы] / рэдкал.: Р.Р. Лазько (адказ. рэд.) [і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – 302 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ